**УДК 37(09)(076)**

# РАЗВІЦЦЁ НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ ПОЛАЧЧЫНЫ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

***канд. гіст. навук В.М. АСТРОГА***
**Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Мінск**

*Аналізуецца развіццё народнай адукацыі ў Полацкім павеце Віцебскай губерні ў другой палове XIX – пачатку XX стст. Робіцца акцэнт на асаблівасцях правядзення ўрадавай адукацыйнай палітыкі ў Беларусі; прыводзяцца статыстычныя дадзеныя аб колькасці выдзяленых сродкаў, адкрыцці міністэрскіх навучальных устаноў і школ духоўнага ведамства. Разгледжаны пытанні кадравага забеспячэння народнай адукацыі гэтага рэгіёна. Вызначаюцца новыя прагрэсіўныя тэндэнцыі і задачы ў сферы адукацыі, якія ўзнікаюць на мяжы стагоддзяў.*

Развіццё адукацыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. у Беларусі, якая з'яўлялася часткай Расійскай імперыі, уяўляла сабой складаны і супярэчлівы працэс. Гэта тлумачыцца перш за ўсё сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі і грамадска-палітычнай сітуацыяй таго перыяда, калі краіна становіцца на шлях капіталістычнай мадэрнізацыі. Гэты працэс, відавочна, мог быць значна паскораны праз рэфармаванне народнай асветы і росту яе статуса ў грамадстве, без чаго нельга было перамагчы невуцтва і адставанне ад краінаў Еўропы. Таму праблемы развіцця адукацыі і школы, а таксама іх кадравае забеспячэнне набываюць небывалую раней вастрыню.

З сярэдзіны XIX ст. імклівымі тэмпамі павялічваецца колькасць народных школ. Дазваляючы адкрыццё пачатковых вучылішчаў, царскі ўрад і не думаў аб іх поўным утрыманні за казённыя сродкі. У 1866 г. з агульнай сумы дзяржаўнага бюджэту на ўсе выдаткі ў галіне асветы прыходзілася толькі 1,6%, прычым на народныя школы – 0,3%. Паказчык увагі дзяржавы да патрэб адукацыі толькі нязначна ўзрастае ў пачатку XX ст. Калі выдаткі ў разліку на аднаго чалавека ў земскіх губернях Расіі склалі 36,1 кап., то ў Віцебскай – 25,5 кап., а ў Магілёўскай – 10,8 кап. [1, с. 12].

Пра стан народнай адукацыі ў азначаны перыяд можна меркаваць па колькасці навучальных устаноў. У цэнтральных губернях у пачатку 1860-х гг. 1 вучылішча прыходзілася на 14 весак, у Беларусі на 33 вёскі, а ў Віцебскай губерні на 83.

У адпаведнасці з адукацыйнай рэформай у 1863 г. ствараецца Віцебская дырэкцыя народных вучылішчаў. На студзень 1865 г. у яе веданні было 260 пачатковых школ. У пачатку 1870-х гг. са сродкаў дзяржаўнай казны на іх утрыманне выдзялялася 13763 руб. [2, с. 14, 36]. На 1 студзеня 1903 г. працавалі 1083 пачатковыя народныя вучылішчы. Агульная колькасць вучняў у пачатку навучальнага года – 38 321 чалавек, што складала 2,7% насельніцтва і 18,9% дзяцей школьнага ўзросту. Па-за школай заставалася 164 330 хлопчыкаў і дзяўчынак, ці 81,1%. На ўтрыманне ўсіх сельскіх вучылішчаў з казны адпускалася 43 316 руб., ад сельскіх грамадстваў ішло 96 601 руб., а таксама 1928 руб. ахвяраванняў з боку прыватных асобаў. Такім чынам, кошт адной школы вызначаўся ў 521 руб. 50 кап., а аднаго вучня ў 9 р. 31 кап. [3, с.25, 33].

Разам з тым дзецям вучыцца, а настаўнікам працаваць прыходзілася ў непрыстасаваных будынках, якія адводзіліся пад школы. Яны не задавальнялі самым сціплым запатрабаванням. Настаўнікі ў сваіх рапартах давалі прыкладна такую характарыстыку школьным памяшканням: цесната, духата, усемагчымыя нязручнасці, у вокнах няма зімніх рам, драўляныя падлогі рэдкія. Узвядзенне новых будынкаў каштавала вельмі дорага для сялянскіх грамадстваў. Так, у 1864 г. у Віцебскай губерні школы размяшчаліся ў хатах, адведзеных пад вучылішчы – 26, хатах святароў – 122, пры валасных праўленнях – 61 і ў хатах, узятых у наём – 61. У 1865 г. на пасяджэнні Віцебскага вучылішчнага савета інспектар пацвердзіў, што скаргі настаўніка Волкава з Верхаўскага вучылішча на «невыносна дрэннае памяшканне, адведзенае як для яго, так і для вучняў, халоднае, угарнае, са злавоннаю атмасфераю, даступнае вятрам і пранікненню снега, нісколькі не перабольшаны» [4, л. 62 ]. І ў пачатку XX ст. большасць школ знаходзілася ў наёмных сялянскіх хатах, якія сяляне называлі "курнымі школамі".

Да 1914 г. у Полацкім павеце было прынята рашэнне пабудаваць 19 вучылішчаў. На дапамогу прыйшоў архітэктар, які зрабіў эскізныя праекты новых школьных будынкаў. Настаўнікі і ўрачы станавіліся абавязковымі членамі будаўнічых камісій. Большую палову сродкаў на гэтыя работы пачала адпускаць казна [5, л. 1].

У Полацкім павеце па стане на пачатак 1915 г. з працуючых 135 пачатковых народных вучылішчаў 47 (34,8%) размяшчаліся ва ўласных будынках і 88 (65,2%) – у наёмных памяшканнях. Навучаннем было ахоплена 6 145 хлопчыкаў і дзяўчынак. Заканамерна паўставала пытанне забеспячэння іх дастатковай колькасцю падручнікаў і дапаможнікаў, стварэння добра абсталяваных школьных бібліятэк як

PolotskSU

"адукацыйных сродкаў" школ. У вучылішчных бібліятэках Полацкага павета мелася 39 971 тамоў кніг (пры 5179 назвах) агульным коштам 10 338 руб. У сярэднім на 1 вучня прыходзілася 7 друкаваных выданняў (падручнікаў і іншай літаратуры) [6, с. 42, 48].

Паралельна з міністэрскімі школамі праводзілі сваю асветніцкую дзейнасць і навучальныя ўстановы ведамства Св. Сінода: царкоўнапрыходскія школы і школы пісьменнасці. Ужо ў 1880–1883 гг. святарства Полацкай епархіі адкрыла 22 царкоўнапрыходскія школы. Адначасова з павелічэннем ліку царкоўных школ павялічваецца і колькасць іх навучэнцаў. Ужо ў 1885 г. у 72 школах было 1390 вучняў (у сярэднім па 19 чалавек на 1 школу). У 1895 г. у 157 царкоўнапрыходскіх школах навучаліся 5685 вучняў (у сярэднім па 36 чалавек). Потым назіралася тэндэнцыя павелічэння колькасці такіх навучальных устаноў, дасягнуўшы самай вялікай адзнакі ў 1905 г. – 13 599 (прыкладна 51 чалавек на 1 школу). Потым гэтая лічба пачала змяншацца з прычыны адкрыцця значнай колькасці міністэрскіх народных вучылішчаў [7, с. 9–10].

Асобных, спецыяльна абсталяваных памяшканняў гэтыя школы не мелі, а калі і мелі, то ў вельмі рэдкіх выпадках. Звычайна яны размяшчаліся ў дамах святароў, дзякаў, царкоўных старожках. Класная мэбля складалася з доўгага стала, перад якім з двух бакоў стаялі такія ж лаўкі. На іх, цесна прытуліўшыся адзін да аднаго, сядзелі дзеці, нярэдка і юнакі, падзяляючыся на "азбучнікаў" і "вяршнікаў" (якія маглі чытаць "па вярхах", без папярэдняга складвання літар). Навучаннем першапачаткова займаліся святары альбо спецыяльна запрошаныя імі для навучання дзяцей асобы (звычайна гэта былі іх родзічы, часцей за ўсё дочкі, якія закончылі епархіяльныя вучылішчы). Як сведчаць дакументы, у 1860–70 гг. ніякай "узнагароды за сваю працу" "вучачыя" ад дзяржаўнай казны не атрымлівалі. Не было аніякіх выдаткаў на абсталяванне школ, на кніжкі і сшыткі. Усё гэта набывалася дзякуючы ініцыятыве, "за царкоўныя ці асабістыя грошы", прычым субсідыі, як правіла, абмяжоўваліся "добраахвотнымі дарамі" бацькоў вучняў, праўда, вельмі нязначнымі. Затое нескладанай была і праграма гэтых школ. Дзеці навучаліся малітвам, святой гісторыі, катэхізісу па "Начатках", чытанню, пісьму, асновам арыфметычных ведаў і абавязкова царкоўным спевам. Расклада заняткаў не было: прадметы і працягласць кожнага ўрока залежалі ад самога настаўніка. Заняткі пачыналіся і заканчваліся малітвай.

Зацверджаныя 13 чэрвеня 1884 г. "Правілы аб царкоўнапрыходскіх школах" далі значны штуршок для развіцця такіх школ у Полацкай епархіі. Ужо ў гэтым годзе святарамі было адкрыта 20 новых школ, а іх агульная лічба дасягнула 44 (43 аднакласныя царкоўнапрыходскія школы і адна школа пісьменнасці). У 1909 г. іх колькасць дасягае 273. Якасна паляпшаецца і кадравае забеспячэнне гэтых навучальных устаноў: у 1895–96 годзе колькасць «праваспасобных» настаўнікаў з ліку свецкіх асоб вырасла да 81% (да гэтага часу ў школах Полацкай епархіі выкладаннем займаліся члены прычта і свецкія настаўнікі, якія не мелі неабходнага пасведчання аб адукацыі) [8, с. 8, 11].

Што тычыцца гарадскіх вучылішчаў, то яны мелі прасторныя і дастаткова зручныя памяшканні. Але і гэтыя навучальныя ўстановы таксама ўтрымліваліся ў асноўным за кошт насельніцтва. Адносна высокая плата за навучанне, адсутнасць пераемнасці ў вучэбных праграмах не давалі шырокай магчымасці дзецям сялян і рабочых атрымаць нават пачатковую адукацыю, не кажучы ўжо аб сярэдняй і вышэйшай. У гарадскіх навучальных установах настаўнік адначасова займаўся прыкладна з 45 вучнямі, у сельскіх жа школах на аднаго выкладчыка прыходзілася ў сярэднім 67 вучняў.

У пачатку ХХ ст. назіраўся значны рост колькасці вясковых пачатковых школ і пік росту школ духоўнага ведамства. Інспектар народных вучылішчаў Віцебскай губерні, аналізуючы ў 1903 г. якасны склад педагагічнага персаналу, робіць выснову, што ён у большасці складаецца з асоб, здольных правільна і паспяхова весці выхаваўчую справу. Сярод іх было 45% тых, хто скончыў настаўніцкія семінарыі, 26% – сярэднія навучальныя ўстановы, а астатнія атрымалі пасведчанні па экзамену. Але самымі пажаданымі кандыдатамі заставаліся семінарысты. У царкоўна-прыходскіх і школах пісьменнасці адукацыйны ўзровень настаўнікаў быў ніжэйшым. У 1904 г. пры 56 свабодных вакансіях не хапала спецыяльна падрыхтаваных кадраў для педагагічнай працы [9, л. 107].

Для падрыхтоўкі настаўнікаў у пачатковыя народныя вучылішчы на тэрыторыі Беларусі адкрываліся настаўніцкія семінарыі. У 1872 г. такая навучальная ўстанова пачала сваю працу ў Полацку. Да верасня гэтага года быў сфарміраваны штат семінарыі і праведзены першы прыём 52 выхаванцаў. На ўрачыстым адкрыцці гэтай навучальнай установы прысутнічалі міністр народнай асветы граф Дз. Талстой, апякун Віленскай навучальнай акругі М. Сергіеўскі, губернатар П. Растоўцаў і інш. [10, с. 2]. Для размяшчэння семінарыі спачатку былі выдзелены памяшканні павятовага двухкласнага вучылішча, а ў 1875 г. было завершана будаўніцтва ўласнага каменнага будынка. Акрамя гэтага на сродкі казны былі пабудаваны інтэрнат для выхаванцаў і кватэры для настаўнікаў. Асноўнай крыніцай утрымання было дзяржаўнае фінансаванне, акрамя таго, пэўныя сродкі паступалі ад сялянскіх грамадстваў, Полацкага царкоўнага брацтва і прыватных асоб. Семінарыя павінна была даваць педагагічную адукацыю маладым людзям, якія жадалі прысвяціць сябе настаўніцкай дзейнасці ў пачатковых вучылішчах. У семінарыю прымаліся асобы пераважна сялянскага саслоўя, выключна праваслаўнага веравызнання, здаровыя, без

фізічных недахопаў. Паступаючыя павінны былі мець узрост 16–18 гадоў і быць свабоднымі ад рэкруцкай павіннасці. Да заявы-прашэння дадаваліся метрычныя пасведчанні аб нараджэнні і хрышчэнні, пасведчанні аб заканчэнні вучылішча і прыходскага святара аб добрых паводзінах. Каб быць залічаным, неабходна было здаць іспыты ў аб’ёме праграм для пачатковых народных школ. Экзаменатары галоўную ўвагу звярталі на “якаснае засваенне прадмета… на разуменне і здольнасць меркаваць”.

У семінарыях на працягу 3-х год вывучалі Закон Божы, педагогіку, рускую і царкоўнаславянскую мовы, арыфметыку, геаметрыю, рускую гісторыю, геаграфію, прыродазнаўства, чарчэнне, чыстапісанне, спевы, гімнастыку, ручную працу. Неабавязковым прадметам была музыка, якая выкладалася па жаданню за кошт семінарыстаў. Такім чынам, семінарыя давала выхаванцам сціплыя веды, якія толькі ў нязначнай ступені перавышалі ўзровень гарадскіх вучылішчаў. На думку міністэрскіх чыноўнікаў, вясковы настаўнік павінен быў ведаць нямнога, але цвёрда і грунтоўна. З 1907 г. у семінарыях Беларусі ўводзіўся чатырохгадовы курс навучання. Былі перагледжаны вучэбныя планы і праграмы, што дазволіла значна пашырыць агульнаадукацыйны і прафесійны ўзровень будучых педагогаў.

Настаўніцкія семінарыі з’яўляліся адзінымі бясплатнымі навучальнымі ўстановамі, якія давалі прафесійную адукацыю. Таму большасць выхаванцаў па паходжанню належалі да ніжэйшых саслоўяў. Так, за 30 год існавання Полацкай семінарыі, з 1223 чалавек дзяцей сялян было 933 (76%), мяшчан – 192 (16%), асоб духоўнага звання – 63 (5%), дваран і чыноўнікаў – 23 (2%) і салдат – 12 (1%). Да паступлення большасць (каля 80%) атрымала адукацыю ў пачатковых народных вучылішчах і толькі невялікая колькасць – у гарадскіх і духоўных вучылішчах, гімназіях і дома [11, л. 8].

Выхаванцы Полацкай семінарыі атрымлівалі 95 руб. і яшчэ дадаткова 5 руб. на кніжкі і вучэбныя дапаможнікі, якія мелі права пасля заканчэння семінарыі пакінуць у сябе. Дырэкцыя пачала практыкаваць назначэнне дзяржаўных стыпендый найбольш дастойным выхаванцам. У 1913 г. яна складала 180 руб. Былі сярод вучняў і “своекоштныя” [12, л. 60].

Значным крокам наперад у справе падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў было адкрыццё настаўніцкіх інстытутаў. У паўночным рэгіёне Беларусі, у Віцебску, такі інстытут пачаў працаваць з 1910 г., рыхтуючы настаўнікаў для пачатковых школ павышанага тыпу. Як і настаўніцкія семінарыі, інстытуты не мелі статуса сярэдніх навучальных устаноў, хаця па аб’ёму ведаў арыентаваліся ў асноўным на гімназічныя праграмы. Спецыяльных педагагічных навучальных устаноў па падрыхтоўцы настаўнікаў для гарадскіх вучылішчаў, гімназій і прагімназій на тэрыторыі Беларусі не было, таму выкладчыкаў для іх запрашалі з цэнтральных губерняў Расіі.

Як сведчаць дакументы, памер заробка настаўніка пачатковай школы на працягу другой паловы XIX ст. вагаўся звычайна ад 150 да 200 рублёў. Частку грошай настаўнік звычайна атрымоўваў ад дзяржавы, а другую (грашыма і натураю – “ссыпкай”) давалі сяляне. З “Дзённіка” сельскай настаўніцы, якая працавала ў Віцебскай губерні, можна даведацца, што на валасным сходзе сяляне вельмі проста маглі адмяніць ссыпку, бо, як яны тлумачылі, “гады худыя, хлеб дарагі… самім есці няма чаго, а тут і таму дай, і другому дай” [13, с. 22]. Пазбавіўшыся нават такой, не заўсёды добрай і якаснай падтрымкі, настаўнік павінен быў жыць на свае мізэрныя грошы. У 1906 г. у шэрагу школ з 1906 г. замест “ссыпкі” пачалі выдаваць грашовую кампенсацыю ў памеры 50 руб. Спробу падлічыць сярэдні настаўніцкі бюджэт на мяжы стагоддзяў зрабіў І.А. Самайловіч – былы інспектар Віцебскай губерні. Атрымалася, што невялікай настаўніцкай сям’і з 4 душ на паўгалоднае харчаванне, з разліку па 4 руб. у месяц на аднаго чалавека, было патрэбна ў год 192. На ўсё астатняе заставалася толькі 8 руб. Інспектар здзіўляўся такому ўменню зводзіць канцы з канцамі і падкрэсліваў, што настаўнікі пры любым зручным моманце пакідалі службу, шукалі іншыя месцы для працы, што негатыўна сказвалася на вучэбна-выхаваўчым працэсе.

У пачатку XX ст. на пасяджэнні вучылішчнага савета Віцебскай дырэкцыі канстатавалася, што “жалаванне ў памеры 250 руб., якое ўстаноўлена як норма, нельга прызнаць дастатковым для асобы, якая спецыяльна да гэтага рыхтавалася і лячыла магчымым доўгі час заставацца на пасадзе настаўніка” [14, л. 106]. У значна лепшым стане знаходзіліся выкладчыкі сярэдніх навучальных устаноў. Выхадцы галоўным чынам з дваранскіх альбо заможных буржуазных класаў яны мелі сярэднюю і вышэйшую адукацыю, і ім прызначаліся добрыя аклады (прыкладна ад 60 да 170 руб. у месяц).

27 снежня 1897 г. у памяшканні Віцебскага гарадскога вучылішча было заснавана першае на Беларусі “Таварыства ўзаемнай дапамогі настаўнікам і настаўніцам Віцебскай губерні”. Адкрыў устаноўчы сход дырэктар народных вучылішчаў Дз. І. Ціхаміраў – стваральнік і кіраўнік таварыства, які адзначыў, што “прыйсці на дапамогу настаўнікам і настаўніцам народных вучылішчаў – наш абавязак і наша павіннасць”. Дзейнасць гэтай арганізацыі заключалася ў выдачы грашовых дапамог, заснаванні інтэрнатаў для настаўніцкіх дзяцей, арганізацыі курсаў, прадстаўленні пуцёвак для хворых у санаторыі і г.д. У 1908–1909 гг. група настаўнікаў Віцебскай губерні выпусціла педагагічныя часопісы “Голос учителя” і “Белорусский учитель”, на старонках якіх выступалі за дэмакратызацыю народнай адукацыі, паляпшэнне матэрыяльнага і прававога становішча настаўнікаў.



PolotskSU

На мяжы XIX–XX ст. з усёй вастрынёй паўставала пытанне рэфармавання сістэмы адукацыі. Прагрэсіўныя педагогі і перадавая грамадскасць асуджалі афіцыйную палітыку ў гэтым накірунку, выступалі за радыкальны перагляд усіх бакоў дзейнасці агульнаадукацыйнай школы, структуры і зместу асветы і выхавання падрастаючага пакалення, арганізацыйных формаў і метадаў навучання, праблемы кадравага забеспячэння. На павестцы дня стаяла задача ўвядзення ўсеагульнага пачатковага навучання на роднай мове, якое павінна было даваць на той час сучасны узровень ведаў і мець свецкі характар.

ЛІТАРАТУРА

1. Снапкоўская, С.В. Асвета на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст.: стан і тэндэнцыі развіцця / С.В. Снапкоўская // Адукацыя і выхаванне. – 1997. – № 8. – С. 11–24.
2. Кукушкин, И.П. Последнее десятилетие в истории Витебской дирекции народных училищ. 1891–1901. / И.П. Кукушкин. – Витебск : Губ. типо-литография, 1904. – 59 с.
3. Самойлович, И.А. Экономическое значение народного образования; положение последнего и его нужды в Витебской губернии. – Витебск : Губ. типо-литография, 1903. – 82 с.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2507. Дырэкцыя народных вучылішчаў Віцебскай губерні. Воп. 1. Спр. 878.
5. НГАБ. – Ф. 3068. Інспектар народных вучылішчаў Полацкага павета. Воп. 1. Спр. 7.
6. Начальное народное образование в Витебской губернии в 1912 году. – Витебск : типо-литография П.А. Подземского, 1915. – 97 с.
7. Краткий историко-статистический очерк развития церковной школы Полоцкой епархии за 1884-1909 гг. / сост. Н. Серебренников. – Витебск : Губ. тип., 1909. – 26 с.
8. Там сама.
9. НГАБ. – Ф. 2519. Віцебская губернаская ўправа па справах земскай гаспадаркі. Воп. 1. Спр. 15.
10. Полоцкая учительская семинария за 30 лет ее существования (1872–1902 годы). Историческая записка. – Витебск : Губ. тип. 1902. – 67 с.
11. НГАБ. – Ф. 2566. Полацкая настаўніцкая семінарыя. Воп. 1. Спр. 482.
12. НГАБ. – Ф. 3260. Рагачоўская настаўніцкая семінарыя. Воп. 1. Спр. 21.
13. В.К. Тяжелая доля. Отрывки из “Дневника” сельской учительницы / В.К. – Витебск, 1903. – 42 с.
14. НГАБ. – Ф. 2519. Віцебская губернаская ўправа па справах земскай гаспадаркі. Воп. 1. Спр. 15.

## THE DEVELOPMENT OF PUBLIC EDUCATION ON THE POLOTSK LANDS IN THE SECOND HALF OF XIX – EARLY XX CENTURIES

***V. ASTROGA***

*The author analyzes the development of public education in the Polotsk district of Vitebsk province in the second half of XIX - early XX centuries. The emphasis is on the peculiarities of the government's educational policy in Belarus, provides statistics on the number of the allocated funds, opening of the ministerial education and schools of spiritual department. We also consider the issues of staffing of public education in this region. Determined new progressive trends and challenges in the field of education, resulting in the turn of the century.*

PolotskSU